

22 лютага ў прасторных залах бізнес-клубу «Imaguru» (Мінск, вул. Фабрыцыўса, 4), адбыўся фестываль, прысвечаны Міжнароднаму Дню роднай мовы. На свяце година быў прадстаўлены і мясцовы дабрачынны фонд “Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага”. Арганізатарамі мерапрыемства выступалі каманда «Арт Сядзібы» і культурніцкая пляцоўка «Беларуская Прастора»

.

На фота – момант свята

На фестывалі адбыліся прэзентацыі шматлікіх беларускамоўных творчых ініцыятыў, праводзіліся моўныя курсы, сваю прадукцыю выстаўлялі вытворцы сувеніраў і паштовак.

Сярод запрошаных удзельнікаў быў заўважаны наш славуты зямляк, кампазітар, дыпламат, паўстанец, грамадскі і палітычны дзеяч Міхал Клеафас Агінскі. Менавіта так! У прэзентацыйна-гандлёвай зоне гасцей вітаў вялікі партрэт Агінскага.

Сябры ж фонду на чале з яго заснавальнікам Уладзімірам Леанідавічам Сівухам прэзентавалі ўнікальную сувенірную прадукцыю, прысвечаную жыццю і творчасці М.К. Агінскага, а таксама маршруты вандровак з серыі “Шляхі роду Агінскіх” па Беларусі і за яе межамі. - Буклеты і іншыя друкаваныя матэрыялы расхапалі бы гарачыя піражкі за першыя гадзіны свята! – распавядае У. Сівуха. – Адметнасць і высокую мастацкую якасць сувенірнай прадукцыі адзначылі не толькі госці мерапрыемства, але і рамеснікі, што ў агульнай гандлёвай залі прапаноўвалі свае вырабы. З некаторымі з іх мы адразу завязалі кантакты для далейшага супрацоўніцтва.

Сапраўды, ля прэзентацыйнага стэнда фонду было людна. Адны наведнікі цікавіліся вытанчанымі кубкамі і вырабамі са шкла, іншым даспадобы прыйшліся драўляныя

скрыначкі, гадзіннікі і магніты. А вось маладзенькія прыгажунькі з задавальненнем прымервалі завушніцы, пярсцёнкі і брошкі. Госці свята выказвалі цікавасць да гісторыка-культурнай дзейнасці фонду: з ахвотай знаёміліся з праграмамі вандровак з серыі “Шляхі роду Агінскіх” і календаром святочных мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 250-годдзя з Дня Нараджэння М.К. Агінскага ў Беларусі і краінах-суседках. Кансультаваў ахвочых сам Уладзімір Леанідавіч і яго памочнікі.

Па выніках мерапрыемства заснавальнік фонду выказаўся так: “Падчас свята я чарговы раз пераканаўся, што беларуская мова і гісторыя яднаюць наш народ, робяць яго непахісным. А творчасць яднае народы. Таму багатая спадчына роду Агінскіх належыць усяму свету і кожнаму з нас!!!”